# 1933

## Пячаткі полацкіх князёў у Беларускім Музэі

Памяткі гэтыя асабліва цэнныя як з пагляду на асобы тых, хто іх па сабе пакінуў, так і з пагляду на малы лік памятак удзельнага пэрыяду ў нас наагул, якія абмежуюцца пераважна царквамі і дзе–якімі царкоўнымі рэчамі. Беларускі Музэй ім. Ів. Луцкевіча мае дзьве вельмі цэнныя памяткі князяўскае ўлады — памяткі старадаўнае беларускае дзяржаўнасьці.

Гэта ёсьць: сыгнэт князя Ўсяслава Полацкага з XI сталецьця (†1101 г.) і пячатка ад сыгнэту князя Барыса з таго ж Полацку — XII ст. (†1128 г.).

Сыгнэт князя Ўсяслава — срэбны, некалі пазалочаны; дыямэтар персьценя — 24 mm, пячатка васьмікутная, разьмеру 20x22 mm. На пячаці — надпіс: КЗ ВСЛВ ПЛТСК (скарочанае „Князь Всеслав — Полатск“) і герб полацкіх князёў. Пячатка ад сыгнэту князя Барыса — срэбная, таксама васьмікутная, але шмат меншая (13x15 mm), з надпісам КЗ БРСЪ і такім жа княжым гербам.

Па даручэньню с. п. Івана Луцкевіча гэтыя рэчы былі куплены для яго ў Дзісьне Вацлавам Ластоўскім у 1915 годзе, аб чым сьведчыць сьпісаны тады ж пратакол. Вось яго зьмест.

### Пратакол знаходкі.

Пячатка і сыгнэт князёў Барыса і Ўсяслава Полацкіх, знойдзены ў 1914 гаду летам у мястэчку Дзісьне дзісенскім мешчанінам Сымонам Рудаком на беразе „Папоўскага вострава“, калі той мешчанін капаў чарвей у пяску пры беразе, дзе ямніцы–ластаўкі маюць свае гнёзды, знайшоў ён цэлую добрую жменю, як казаў, бляшак і пярсьцёнікаў і прадаў жыду за 6 рублёў. Ведамасьць аб ім Ластоўскі Вацлаў дастаў ад Варгаўціка, а пасьля той сам Сымон Рудак яму, Ластоўскаму, усё гэта расказаў. Пячатка і сыгнэт куплены Ластоўскім, як ён мне казаў, у Малецкага дзісенчука мешчаніна за 3 рублі. Што сьцьвярджаю маім подпісам

| | |
|---|---|
| Адціскі пячатак | (—) *Іван Луцкевіч* |
| на ляку | (—) *В. Ластоўскі* |

Вільня, 29 іюня 1915 году.

Вельмі цікаўны герб, якім карысталіся полацкія князі на сваіх пячацях.

Як ведама, паміж князямі полацкімі і кіеўскімі існаваў блізкі зьвязак па крыві. Кіеўскі князь Уладзімір у 980 годзе напаў быў на Полацак, забіў полацкага князя Рагвалода і гвалтам узяў за жонку сабе дачку забітага, князёўну Рагнеду. Ад Рагнеды Ўладзімір меў чатырох сыноў; старшаму зь іх, Ізяславу, ён даў Полацкае княства ў дзедзічнае ўладаньне. Ад Ізяслава ж пачынаецца род гістарычных полацкіх князёў, якія, зусім зразумела, павінны былі ўжываць герб пачынальніка роду па мужчынскай лініі, значыцца Ўладзіміра Кіеўскага, а не па жаноцкай (Рагвалода, бацькі Рагнеды).

Аднак герб полацкіх князёў крыху розьніцца ад свайго прататыпу: на нашых пячатках рысунак гербу спрасьціўся. На пячатцы кн. Барыса ёсьць зьнізу і зубец, як на манэце Ўладзіміра. На Ўсяслававым сыгнэце, шмат старэйшым, такога зубца няма, бо для яго проста не аказалася месца з прычыны надпісу пад гербам ПЛТСК.

Цікава адзначыць, што і герб тураўскіх князёў прадстаўляе мадыфікацыю гербу кіеўскага, толькі ж у ім левае плячо прыняло кшталт крыжа (гл. манэту кн. тураўскага Сьвятаполка, X ст.).

## Праўда аб „Мужыцкай Праўдзе“

У працах некаторых польскіх дасьледчыкаў аб польскім паўстаньні 1863 году[1] часта можна спаткацца з заявай, што ведамы павадыр паўстаньня Костусь Каліноўскі выдаваў падчас паўстаньня *беларускую газэту* „Мужыцкая Праўда“. Заява гэтая да нядаўных часоў паўтаралася і беларускімі адраджэнцамі, якія, стараючыся выкарыстаць для сваей акцыі ўсё, што гаварыла аб ранейшых праявах беларускага руху, вельмі даверчыва аднесьліся да гэтае запраўды ж рэвэляцыйнае весткі. Дый існавалі пэўныя аб'ектыўныя прычыны, якія вестку гэту рабілі падобнай да праўды для кожнага, хто *ня меў у руках і ня бачыў* друкаў Каліноўскага: справа ў тым, што гэныя друкі мелі адзін агульны назоў „Мужыцкая Праўда“ і былі нумараваныя, дык стуль пэўна і паўстаў пагляд на іх як на газэту.

Цяпер, калі большасьць нумароў „Мужыцкае Праўды“ ўжо апублікавана ў друку (гл. „Полымя“, № 1, 1926 г., Менск), мы можам увачавідкі пераканацца, што *газэтай „Мужыцкая Праўда“ не была.* Гэта быў папросту *цыкль адозваў* пад адным агульным загалоўкам, зьмешчаным зьверху дробным друкам, з чарговымі нумарамі (як, да прыкладу, у прыказах або цыркулярах улады). Кожны нумар зьмяшчаў у сабе толькі *адну адозву* і — нічога болей. Выходзілі яны непэрыядычна і наагул з *газэтай ня мелі нічога супольнага*: ніякіх вестак, ніякіх інфармацыяў лістоўкі гэтыя не давалі, зьмест жа адозваў меў на мэце падняць беларускае сялянства проці Масквы і здабыць ягоную прыхільнасьць для „польскага ронду“ (гэтак Каліноўскі зьбеларушчыў ня вельмі ўдатна польскае слова „rząd“).

Характэрна, што сам жа Каліноўскі ў „Муж. Праўдзе“ называе гэтыя лістоўкі *сваімі пісьмамі,* ня маючы ніякае прэтэнзіі да назову „газэты“.

Разумеем, што для некаторых беларускіх дзеячоў, далёкіх ад навуковае працы і навуковага падыходу да вывучэньня нашае мінуўшчыны, вельмі прывабнай магла быць думка пашыраць у масах перакананьне, што беларусы ўжо 70 гадоў назад мелі сваю прэсу, якая, як ведама, для кожнага народу зьяўляецца ў пэўнай меры паказчыкам яго культурна–нацыянальнае дасьпеласьці. На жаль, пагляд на „Мужыцкую Праўду“ як на газэту далёкі ад аб'ектыўнае праўды, аб чым кожын дасьледчык можа асабіста вельмі лёгка пераканацца: у Вільні ў Бібліятэцы ім. Урублеўскіх[2] перахоўвуецца адзін экзэмпляр „Мужыцкае Праўды“, і кіраўнікі Бібліятэкі ахвотна дазваляюць зацікаўленым асобам агледзець яго.